К 75-летию освобождения Бела




# ...Каб не забылі

**У азнаменаванне 75-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, з мэтай захавання памяці аб героях-земляках Вялікай Айчыннай вайны, патрыятычнага выхавання моладзі і падрастаючага пакалення Пінская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма правяла раённы агляд-конкурс на лепшую тэатралізаваную імпрэзу «Ішоў наш край дарогамі вайны».**



У конкурсе прыняла ўдзел 31 бібліятэка. Пераможцамі сталі аддзел абслугоўвання і інфармацыі цэнтральнай раённай бібліятэкі імя Яўгеніі Янішчыц, Лагішынская гарпасялковая бібліятэка, Парахонская сельская бібліятэка.

Дыпломамі адзначаны Пінкавіцкая СБ (за тэатралізаванае прадстаўленне «Жыве ў сэрцы памяць пра вайну») і Азарыцкая СБ (за прадстаўленне «Мы верили, мы знали – победим!»).

З вялікім захапленнем прысутныя і члены журы глядзелі тэатралізаваныя імпрэзы, падрыхтаваныя бібліятэкарамі Бабрыкоўскай, Калавуравіцкай, Парэцкай, Табульскай, Каменскай, Сошненскай, Навадворскай, Каўняцінскай, Аснежыцкай, Плешчыцкай, Лапацінскай, Бярозавіцкай, Кашавіцкай, Дамашыцкай і Садоўскай сельскіх бібліятэк.

З нагоды юбілею вызвалення Беларусі ў бібліятэках раёна праводзяцца тэматычныя вечары, урокі мужнасці, выступленні літаратурна-паэтычных груп, літаратурна-музычныя кампазіцыі. Бібліятэкары наведваюць паважаных ветэранаў.

**Алёна АНТАШУК,**
**дырэктар раённай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы.**